*Ганна Емялёва*

# АНТРАПАМОРФНЫЯ СНАПЫ Ў КАЛЯНДАРНАЙ АБРАДНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ

На тэрыторыі Беларусі антрапаморфныя снапы ў каляндарнай абраднасці сустракаюцца ў перыяд жніва (першы зажынкавы, або апошні дажынкавы сноп), а таксама на Каляды (сноп, які стаіць на куце пад абразамі на працягу ўсіх Каляд; сноп ў абрадзе «Цягнуць Каляду на дуб»).

Жніўныя снапы зафіксаваныя ў розных этнаграфічных рэгіёнах Беларусі напачатку жніва і напрыканцы яго, іх звязванне з'яўлялася часткай абрада. Зажынкавыя і дажынкавыя снапы надзяляліся асаблівым сакральным статусам, часта маглі мець выразныя антрапаморфныя рысы, якія праяўліся не толькі ў найменні гэтых аб'ектаў («баба» [7, с. 180], «дзед» [5; с. 161; 6, с. 30, 196], «гаспадар» [5, с. 161; 6, с. 196], «гаспадар поля» [6, с. 196], «хазяін» [5, с. 161], «госць» [7, с. 180], «спадар і спадыня» [6, с. 196], «дзед і баба» [6, с. 196] і інш.), але і непасрэдна ў іх знешнім выглядзе.

Зажынкавыя і дажынкавыя снапы маглі быць рознага памеру - маленькія (у адну-тры жмені) і вялікія, форма снапа ў розных этнаграфічных рэгіёнах магла мець свае лакальныя варыянты. Акрамя найбольш пашыранай формы – жмені жыта, перавязанай пад калоссем, у Панямонні рабілі парныя, здвоеныя снапы [6, с. 196], пры гэтым маглі зрабіць з аднаго боку каласы ўверх, а з другога - ўніз [6, с. 205]. «Як зажынаюць жыта, то «дзеда» і «бабу» вяжуць. Перавяслам перакруцяць і два гэтыя снапкі ўпоруч звяжуць. Дзень жнём, а тады гэтыя снапкі нясём дахаты і ставім у кут». (Гэлена Бачаноўская, 1927 г.н., в. Палубнікі, Лідскі раён) [6, с. 196]. У Брэсцкім Палессі сустракаюцца снапы ў форме крыжа і вянка [7, с. 185]. У в. Лелікава Кобрынскага раёна «вязалы віночка крэсціком і гэты крэсцік святылы потом» [7, с. 185]. «А после вэночка робымо: набэрэмо колосочков хороших, одрэжэм сэрпом эту соломку і покінэм на полі эту соломку. А колосочкы звязваем коснычком і цвэтамы, увязваем у хусточку біленькую і нэсэм дохаты этого вэночка і ставім на покуті. І тату кажу: «Тато, прынэсла я вэнка, ужэ мы дожалы жыто, а вэночка для Вас, шоб Вы посвятылы, да посіялы і шоб родыло жытэйко вэлікое і доброе». А він мні ўжэ дае пятьдэсят копеёк, або злоты польскы – шчэ булы. І ужэ на Спаса это жытэйко святым. І тато як ужэ згорэ полэ да жыто сіяты, то бэрэ этого вэночка на полэ з собою. І коробка ў ёго була з такым вышытым полотном, бы ручнык, на шыю. Обтэрусыть, оботрэ тыйі колосочкы і засівае этым святым жытом» (Вера Райчук, 1921 г.н., в. Стытычава, Ніна Барычэўская, 1927 г.н., в. Жолкіна, Пінскі раён) [7, с. 185-186]. Снапы перавязваліся ў адным, двух або трох месцах і маглі ўпрыгожвацца тканінай, стужкамі, ніткамі, кветкамі, зеллем, ягадамі рабіны або каліны. Выразныя антрапаморфныя якасці набывалі снапы, абвязаныя хусткай, або нават апранутыя ў кашулю. «У Бельскім павеце Смаленскай губерні апошні сноп абвязваюць хусткаю і адзяваюць на яго кашулю, называючы яго «бабай» [2, с. 270]. У в. Прэціма Шчучынскага раёна «дзеда» вязалі ў выглядзе антрапаморфнага пудзіла: «Як дажыналі жыта, рабілі дзеда: велькі такі сноп і на ём запляталі тры касы. Раздзелім на тры пасмы зверху і да перавясла, і пляцём: у гэтыя косы ўплятаем кветачкі палявыя і шапку каласкамі ўбіралі» [6, с. 205].

У дажынкавым абрадзе мог прысутнічаць антрапаморфны маскіраваны персанаж: дзяўчына, упрыгожаная дажынкавым вянком, якую называлі «багіня» ці «талака» [2, с. 263-265], або мужчына, увязаны ў салому, як у в. Бершты Шчучынскага раёна. «А як уся вёска скончыць жніво, тады рабілі дажынкі. Увязвалі чалавека, мужчыну ў салому – так увяжуць, што і мала заметна гэтага чалавека, толькі ён сам бачыць дзе трошкі. Шлі ў канец вёскі: цягнулі барану, плуг, саху, неслі сярпы, косы. Самі ўсе прыбраныя ва ўсё вышыванае: блюзкі вышываныя, юбкі вышываныя, касыначкі вышываныя – харашо прыбраныя. Гэта ўжэ больш была маладзёж. Яны ідуць і спяваюць, а ў канцы вёскі там ужэ гуляюць, танцуюць. А тады разарвуць гэту салому з чалавека і пакідаюць там» (Вольга Шаставіцкая, 1908 г.н.) [6, с. 208]. У Смаргонскім раёне дажынкавы вянок надзявалі гаспадару поля, падвязвалі яго самога перавяслам [6, с. 208].

Зажынкавыя і дажынкавыя снапы захоўвалі ў хаце на куце, пад абразамі (да Прачыстай, Іспаса, Багача), а потым асвячалі ў царкве і засявалі ўвосень або ўвесну асвечаным зернем поле. На Віцебскім Падзвінні (в. Мураўшчына, Полацкі раён) зажынкавы сноп маглі не выкарыстоўваць для засевак, а пакінуць да наступных зажынак, пакуль, не мянялі на новы, падкурвалі ім дзяцей ад пуду (в. Лыска, Гарадоцкі раён), падпаясваліся першым зжатым калоссем, каб не балела спіна (в. Багатырскае, Полацкі раён) [5, с. 162]. На Брэстчыне першы сноп першым клалі ў гумно, або ставілі на кут на ўсё жніво, а потым змалачвалі зерне і абсыпалі ім усё жыта, каб зберагчы ўраджай [7, с. 185]. На Панямонні, дзе першы сноп ставілі на покуць, покуль не скончыцца жніво, а тады першым пераносілі ў гумно, каб зярно не паелі мышы, пасля чаго пачыналі звозіць з поля астатнія снапы. «Ён у покуці пастаіць, пакуль жыто не ўносяць у клець. Як звозяць жыто, тады бацько бярэ гэты снапочак, адрывае з яго некалькі каласкоў на асвячэнне, а астальное нясе і кладзе яго первым у клець. А тады ўжо кладуць снапы ўсе, што нажалі» (Ірына Себасцьян, 1938 г.н., в. Нацкава, Мастоўскі раён) [6, с. 197]. Захоўвалі зажынкавы сноп, «штоб ня біла граза, штоб не лажыў хлеб ураган, не аббіваў град» [5, с. 162]. «Зажынкавы дзядок – старажыць хаты, яго торкалі за абразы, яго абіваюць і сеюць, як сеялі жыта, таксама ўкопвалі ў зямлю» (Пастаўскі раён) [1, с. 452]. Дажынкавы сноп рабілі, каб «посвятылы, да посіялы і шоб родыло жытэйко вэлікое і доброе» [7, с. 185-186].

На Каляды таксама рабілі адмысловы сноп, які стаяў на покуці ўвесь святочны перыяд ад Раства да Вадохрышча і меў назву «Каляда». «На куце Каляда стаіць. На куце ж Каляду стаўлялі, і на кут кашу

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

стаўляюць. Каляда – з саломы рабілі такі пучок Каляды, украшалі цвятамы, стаўлялі з саломы, падкладалі пад яе сена трошкі і Каляду стаўлялі. Як снопік вот. З саломы, жытняю толькі рабілі, калосся сюды во вверх, каласкі ўсё ў места, а тутака звяжам, а тутака во цвятамі прыбяром Каляду. Цвяты рабілі самы, з бумагі. Ён (бацька ці дзед?) прынясе сноп саломы, у хату кіне, а дзеці рабілі, як первая Каляда, перад Ражаством. Стаяла ўсе Каляды. А тады выносяць, пасвяцонай вадой папырскаюць Каляду, а тады выносяць у хлеў, пазатыкаюць дзе, а сена карове аддадуць» (запісана Емялёвай Г. Ю. ад Казека Улляны Дзянісаўны, 1926 г.н., в. Кострычы, Кіраўскі раён). Звычай ставіць на покуці сноп, упрыгожаны markdown рознакаляровымі каснікамі існаваў у паўднёва-заходніх раёнах Брэсцкага Палесся [7, с. 26]. Гэта мог быць першы, або апошні сноп (з жыта, або пшаніцы), асвячоны на Спаса ці на Успленне ў царкве і спецыяльна захаваны да Калядаў [7, с. 30, 180, 186]. Пасля Вадохрышча частку снапа пакідалі на засеўкі, а частку аддавалі з'есці карове ці авечкам. «До клуны ідэмо, папа бырэ снопа і кажэ мэні: «На, трымай, я буду робыты коледу, а ты трымай». А коледа – то цвіток такы

з колоскуў. Я трымаю, а папа вытягае, вытягае по два колосочкы, по тры колосочкы і мні дае. Вот такую жмэню натягае і звяжэ жытом, потом возьмэ сэрпа, одрыжэ – то такая квітка, коледа. А я рада, а довольна, шо я нэсу коледу, ўвоходэмо ў хату і папа кажэ до мамы: «Ну, Домночка, будь здорова. З коледою! Поздраўляю тэбэ з Рожэством Хрыстовым, з Господнею коледою! Шоб даў Буг жылы і дождалы ўсі до будушчэго года, усі жывы, здоровы шоб булы» (Марыя Пасцярук, 1922 г.н., в. Казловічы, Брэсцкі раён). Традыцыя ставіць на кут снапок – «Каляду» зафіксаваная і ў Нясвіжскім раёне [8, с. 42].

Напрыканцы Каляд у Магілёўскім Падняпроўі і Цэнтральнай Беларусі існаваў звычай цягнуць Каляду на дуб, у адным з зафіксаваных варыянтаў гэта значыла зацягваць на дуб упрыгожаны сноп. «Як цягнулі Каляду – снапок украшалі красіва: жанчыны, дзевачкі ўкрашалі. Нада якога хлопца папрасіць, штоб ён усьцягнуў яго на дуба. У нас, напрымер, снапок, што мы ў прошлам гаду павесілі, па дарозе, як едзем на Марціянаўку, ён і па сей дзень вісіць там» (Ніна Путрык, 1944 г.н., в. Падвалошка, Бярэзінскі раён) [8, с. 85]. Замест снапка маглі зацягваць чучалы, або куццю «Тады сабіраліса, цягалі Каляду на дуба: тожа там гулялі, перазываліса, калядавалі. На дзеравы цягнулі чучалы. Чучалы былі з саломы, іх мужчыны вешалі. Чучала было ў рубахе, штаны, рукі паставяць, чучала было як мужчына, жэншчынамі чучалаў не вешалі. Было і па два вешалі, на любое дрэва ў сяле» (Таццяна Корык, 1929 г.н., в. Галаўныя Ляды, Бярэзінскі раён). У Слонімскім раёне зафіксаваны падобны звычай, калі «для неба, для бога» на дрэва ставілі рэшткі куцці, якая з'яўлялася пэўным ахвярапрынашэннем [8, с. 85].

Такім чынам можна адзначыць, што снапы збожжа ў каляндарнай абраднасці часам маглі набываць пэўныя антрапаморфныя рысы, у якасці іх семантычных аналагаў выкарыстоўваліся чучалы, маскіраваныя персанажы. Семантыка гэтых аб'ектаў непасрэдна звязаная з семантыкай абрадаў, у якіх яны прысутнічаюць; у першую чаргу антрапаморфныя снапы выступаюць як сімвал плоднасці, багацця і неперарыўнай цыклічнай урадлівасці.

**Спіс літаратуры:**


1. Валодзіна, Т.В. Сноп / Т.В. Валодзіна // Міфалогія беларусаў : энцыклапед. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2011. – С. 452.
2. Земляробчы календар : Абрады і звычаі / уклад., класіфікацыя, сістэматызацыя матэрыялаў і камент. А.І. Гурскага ; уступ. арт. А.І. Гурскага, А.С. Ліса. – 2-е выд., выпр. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – 429 с.
3. Кухаронак, Т.І. Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т.І. Кухаронак. – Мінск : Ураджай, 2001. – 239 с.
4. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. Т. 1 : Магілёўскае Падняпроўе / [аўт.: В.І. Басько і інш. ; пад. агул. рэд. Т.Б. Варфаламеевай]. – Мінск : Выш. школа, 2001. – 790 с.
5. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў.: у 6 т. Т. 2: Віцебскае Падзвінне / [аўт.: В.І. Басько і інш. ; пад. агул. рэд. Т.Б. Варфаламеевай]. – Мінск : Выш. школа, 2004. – 910 с.
6. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. Т. 3 : Гродзенскае Панямонне. У 2 кн. Кн. 1 / [аўт.: В.І. Басько і інш. ; пад. агул. рэд. Т.Б. Варфаламеевай]. – Мінск : Выш. школа, 2006. – 608 с.
7. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. Т. 4 : Брэсцкае Палессе. У 2 кн. Кн. 1 / [аўт.: В.І. Басько і інш. ; пад. агул. рэд. Т.Б. Варфаламеевай]. – Мінск : Выш. школа, 2008. – 559 с.
8. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. Т. 5 : Цэнтральная Беларусь. У 2 кн. Кн. 1 / [аўт.: В.І. Басько і інш. ; пад. агул. рэд. Т.Б. Варфаламеевай]. – Мінск : Выш. школа, 2010. – 847 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ